Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІПЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №143 (28507)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Лічбы ў жыроўках зменшацца?

СТАР. 4




Незвычайныя «лайкі» і дача для суседкі

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# Усім лыжкам лыжка

На Крывінскім тарфяніку ў Бешанковіцкім раёне, дзе знаходзіцца адзін з самых унікальных на тэрыторыі Усходняй Еўропы комплексаў неаліту — бронзавага веку, археолагі знайшлі лыжку, якой чатыры тысячы гадоў.



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік археалагічнай экспедыцыі кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Максім ЧАРНЯЎСКІ дэманструе знаходку.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ала СТАШКЕВІЧ, начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі:**

*«Цяпер трэба ў кожным рэгіёне складаць план захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны. ЮНЕСКА распрацавана структура такога плана. Наша галоўная задача сёння — выявіць праблемы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Беларусі. Нематэрыяльная спадчына значна адрозніваецца ад матэрыяльнай, паколькі тут трэба забяспечыць устойлівую эканамічную стабільнасць развіцця рэгіёна, прыцягваць інвестыцыі — разгортваць цэлую сістэму па забеспячэнні жыццядзейнасці гэтага элемента».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9430 | ▼ |
| Еўра | 2,2771 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0749 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Штодзённая эканоміка

## Трацім больш, чым зарабляем?

### Але аддаём перавагу больш танным таварам

**Рознічны тавараабарот за студзень — чэрвень 2017-га склаў 100,3% у супастаўных цэнах да аналагічнага перыяду мінулага года. Тым часам рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ў студзені — маі 2017-га склалі 98,8% да ўзроўню студзеня — мая 2016-га. Гэта азначае, што беларусы гатовы траціць свае зберажэнні, каб падтрымліваць пэўны ўзровень жыцця. Вынікі паўгоддзя на прэс-канферэнцыі падвяла намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Ірына НАРКЕВІЧ.**

### ДЗЕ НАБЫЦЬ...

Такую тэндэнцыю пацвярджае і сітуацыя на валютным рынку: за першае паўгоддзе фізічнымі асобамі прададзена замежнай наяўнай валюты на $1,34 млрд больш, чым куплена. Да таго ж актывізавалася спажывецкае крэдытаванне: аб'ём крэдытаў вырас на 17%. Ды і кожны з нас можа ўбачыць колькасць растэрміновак, якія прапаноўваюць крамы. Усё гэта паўплывала на рост тавараабароту ў нехарчовай галіне.

Нягледзячы на тое, што на харчаванне выдаткі насельніцтва практычна не зменшыліся, працягваецца тэндэнцыя мінулага года: беларусы аддаюць перавагу больш танным аналагам унутры гандлёвых груп.

СТАР. 3

■ Праверана на сабе

## КУПІЦЬ УСЁ ДА ШКОЛЫ

### Чаму бацькоўскіх сходаў баяцца... бацькі?

Карэспандэнт «Звязды» атрымаў заданне вызначыць, у якую прыкладна суму абыдзецца падрыхтоўка дзяцей да заняткаў у школе. І даведаўся пра спосабы сэканоміць.

СТАР. 4




Фота БЕЛТА.

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 12 дзён

## На ўсе 100!!!

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца ў суботу, 29 ліпеня, на спартыўнай пляцоўцы сталічнага ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**

# ДА БЯСПЕКІ — СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД

## Прэзідэнт правёў нараду з кіраўніцтвам Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі

**Абмяркоўвалася старшынства Беларусі ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, сумесныя стратэгічныя вучэнні Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017», узровень бяспекі падчас правядзення Другіх Еўрапейскіх гульняў, а таксама аптымізацыя сілавога блока...**

Трэба сказаць, што прыкладна месяц таму Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з Адміністрацыяй Прэзідэнта, дзе звярнуў увагу на перыядычнасць вынясення на ўзровень кіраўніка дзяржавы асобных пытанняў. Так, палітычны «штаб» кіраўніка дзяржавы — гэта Адміністрацыя Прэзідэнта, эканамічны — урад, а за бяспеку адказвае Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі.

— Натуральна, у гэтых структур рана ці позна з'яўляюцца пэўныя пытанні, якія трэба абмяркоўваць, рашаць з Прэзідэнтам, — заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас учарашняй нарады.

У першую чаргу ён звярнуўся да пытанняў сістэмы калектыўнай бяспекі ў рамках АДКБ, паколькі, як вядома, наша дзяржава старшынствуе цяпер у гэтым аб'яднанні:

— Заўсёды ад Беларусі чакаюць эфектыўнага старшынства, і нам трэба абмеркаваць коратка, безумоўна ж, пытанне, як развіваюцца падзеі па нашым старшынстве. Як мы здзяйсняем заяўленыя кірункі дзейнасці — а такая практыка ў АДКБ ёсць заўсёды: калі старшынствуючая краіна заяўляе пра магчымыя кірункі дзеяння падчас свайго старшынства. І галоўнае — апагей нашага старшынства — сесія Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, якая пройдзе восенню. Таму на гэтую тэму нам трэба звярнуць пэўную ўвагу.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абмеркаваць і вучэнні «Захад-2017», якія апошнім часам неадназначна трактуюцца заходнімі СМІ, а таксама некаторымі інфармацыйнымі рэсурсамі нашай краіны.

— У гэтай частцы я хацеў бы пачуць нешта новае, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — Усім усё растлумачылі. Вучэнні адкрытыя, мы запрашаем або ўжо запрасілі велізарную колькасць назіральнікаў: прыязджайце, глядзіце. Яны (вучэнні. — **Аўт.**) носяць абарончы характар, і мы разам з Расійскай Федэрацыяй традыцыйна іх праводзім. Тут мяне цікавіць толькі нешта новае, калі з'явілася.

Далей Прэзідэнт звярнуў увагу на пытанні, звязаныя з пагранічнам.

— Было даручэнне Дзяржсакратарыяту працягнуць праверкі Пагранічнага камітэта, дзейнасць нашых пагранічных службаў па сваіх функцыях, — згадаў ён. — Чаму? Адказ просты: нелегальная міграцыя, кантрабанда, наркотыкі і іншае... На жаль, паток не змяншаецца і нашы пагранічнікі працуюць у гэтай частцы напружана.

У 2019 годзе ў Беларусі пройдзе маштабнае спартыўнае мерапрыемства: Другія Еўрапейскія гульні. Безумоўна, важна, каб яны былі арганізаваны так, каб пытанняў у плане бяспекі проста не ўзнікала:

— Мы іх годна павінны правесці. Сюды з'едзецца ўся Еўропа, ды і не толькі. Будуць жа назіральнікі ў нас і з Амерыкі, і з Азіі, і з Афрыкі. Таму эпіцэнтрам становіцца Мінск і мы сур'ёзна павінны да гэтага рыхтавацца.

Не абмінуў кіраўнік дзяржавы і аптымізацыю сілавых структур:

— Яшчэ раз хачу прынцыпова гэтага пытання падкрэсліць. Відаць, мы аптымізуемся вось такім чынам на ўзроўні Прэзідэнта з пэўным ідэалагічным забеспячэннем гэтага пытання апошні раз. Мы вызначым узровень колькасці, мы вызначым затраты на тыя ці іншыя кірункі, прывядзём гэта ў адпаведнасць з бягучым годзе. А ў будучым пытанні аптымізацыі не знікнуць, але гэта ўжо задача кіраўнікоў ведамстваў. Усё, што яны там сэканомяць, — гэта іх. Мы іх проста будзем трымаць на кантролі і стымуляваць да аптымізацыі структур. Але ўжо не на самым высокім узроўні і не ў маштабах краіны, як мы гэта робім цяпер.

Умацаванне грамадскай бяспекі і дысцыпліны таксама абмеркавалі падчас нарады. Тэма Дырэктывы №1 па-ранейшаму актуальная для Беларусі.

— Не магу сказаць, што мы дасягнулі вяршыні ў гэтым плане, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Таму пытанне дысцыпліны — пытанне нумар адзін. Асабліва гэта залежыць ад сілавога блока, ад паводзін ваеннаслужачых, людзей у пагонах.

Так, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што рэгулярна звяртае ўвагу міністра ўнутраных спраў на наступны факт: курсанты, маладыя ваенныя, якія праходзяць навучанне, могуць быць задзейнічаны ў патрулях на вуліцах нашых гарадоў. Такая практыка, нагадаў Прэзідэнт, існавала ў савецкія часы. Такім чынам, людзі ў пагонах змогуць пры неабходнасці аказаць тэрміновую падтрымку прахожым, кіроўцам, работнікам Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі...

— Мы павінны дэманстраваць перад людзьмі тое, што мы нездарма ядзім хлеб, — паўтарыў кіраўнік дзяржавы тэзіс, які ўжо агучваў раней. — Бо мы існуем на іх грошы. Таму гэта вельмі важнае пытанне — дзяжурства ваеннаслужачых патрулёў... Ведаеце, думаю, людзям спакайней, калі ваенны чалавек на вуліцы.

Акрамя гэтага, упэўнены кіраўнік дзяржавы, ваенны чалавек павінен знаходзіцца сярод людзей, а не, напрыклад, сядзець у казарме.

— Ён павінен быць сярод людзей. Ён дзеля людзей жыве і дзеля людзей працуе, — аргументаваў Аляксандр Лукашэнка. — Таму гэта вельмі важны элемент. І вялікая дапамога і падтрымка Міністэрству ўнутраных спраў. Таму што міліцыя грамадскай бяспекі — гэта сур'ёзная падмога.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

**У тэму**

### Узровень злачыннасці знізіўся

**Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі,** паведаміў журналістам, што падчас нарады Прэзідэнту было далажана і пра вынікі работы сілавых і праваахоўных органаў за першае паўгоддзе:

— Трэба адзначыць, што ўсе дзяржаўныя органы гарантавання нацыянальнай бяспекі адпрацавалі ў штатным рэжыме без зніжэння эфектыўнасці прафесійнай дзейнасці. Вынікі па ўсіх асноўных кірунках дзейнасці станоўчыя. Мы адзначаем і зніжэнне злачыннасці, зніжэнне колькасці забойстваў, разбояў, крадзяжоў... Менш становіцца ДТЗ і пацярпелых у ДТЗ, меншая сёлета ў параўнанні з мінулым годам колькасць пажараў і пацярпелых людзей на пажарах. У нас адзначаецца паляпшэнне і ў ахове дзяржаўнай мяжы, і ў рабоце мытных органаў. У прынцыпе, вынікі першага паўгоддзя для праваахоўных і сілавых органаў станоўчыя.

Дзяржсакратар Савета Бяспекі паведаміў, што кіраўнік дзяржавы даручыў праваахоўным органам пракантраляваць шэраг пытанняў уборачнай кампаніі. Асаблівая ўвага — гатоўнасці тэхнікі да ўборкі, клопату пра захаванасць сабранага ўраджаю.

# ЭЛЕКТРОННЫ ПАДРУЧНІК ЦІ ТРАДЫЦЫЙНЫ?

**У Беларусі неабходна ўкараняць электронныя падручнікі без адмовы ад друкаваных. Такое меркаванне сёння, адказваючы на пытанні работнікаў прадпрыемства «Алеся», выказала міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Па інфармацыі БЕЛТА, міністр азнаёмілася з вытворчасцю і асартыментам прадукцыі, якую выпускае кампанія. Яна выказала меркаванне, што прадпрыемству трэба больш раскручваць свой брэнд, які карыстаецца заслужанай папулярнасцю ў старэйшага пакалення і можа быць не менш папулярны сярод цяперашняй моладзі. Міністр адзначыла, што прадпрыемства валодае дастатковым рэсурсным і кадравым патэнцыялам, каб вырашаць гэтае пытанне.

Разважаючы з калектывам, Лілія Ананіч падрабязна спынілася на асноўных аспектах сацыяльна-культурнай палітыкі беларускай дзяржавы. Традыцыйнаму мастацтву, нацыянальнаму кіно, тэатру і іншым сферам у Беларусі ўдзяляецца вялікая ўвага. Штогод на развіццё культуры накіроўваецца больш за BYN420 млн. У краіне рэалізуецца адпаведная дзяржпраграма.

Што да электронных падручнікаў, то Лілія Ананіч паведаміла, што днямі спецыялісты Міністэрства інфармацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі абмяркоўвалі перспектывы навучальнага кнігавыдання. Яна адзначыла, што калегі з Міністэрства адукацыі выступаюць за тое, каб не адмаўляцца ад папяровых падручнікаў, даючы пры гэтым магчымасць доступу да электронных. У Мінінфарме такія падыходы падзяляюць.

Міністр адзначыла, што ў перспектыве ў Беларусі пераўтварэнне ў IT-краіну. «Маладое пакаленне, цяперашнія школьнікі будуць рабіць гэтую новую эканоміку. Яны павінны быць на ты з новымі тэхналогіямі», — перакананая яна.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## НА АДЛЕГЛАСЦІ ЗВАНКА

**Заўтра, 29 ліпеня, на традыцыйных прамых лініях у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме, якія штотыдзень праходзяць па суботах з 9.00 да 12.00, на звароты і пытанні грамадзян будуць адказваць:**

- намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч. Тэл. 8 (016) 2213121;
- намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч. Тэл. 8 (021) 2222222;
- намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама КАНЮШКА Андрэй Васілевіч. Тэл. 8 (023) 2751237;
- першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ЖУК Іван Алейзавіч. Тэл. 8 (015) 2735644;
- кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч. Тэл. 8 (022) 2501869;
- намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама СІРЭНКА Віктар Іванавіч. Тэл. 8 (017) 5004160;
- кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама МАТЭЛЬСКАЯ Ганна Мар'янаўна. Тэл. 8 (017) 2224444.

**Факт**

## 395 БЕЛАРУСАЎ ПЕРААДОЛЕЛІ СТАГАДОВЫ РУБЕЖ

**Больш за ўсё доўгажыхароў — у Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. У кожнай з іх, паводле даных на 1 ліпеня гэтага года, пражываюць па 65 чалавек, якім больш за 100 гадоў. У Мінску такіх доўгажыхароў — 51 чалавек, у Брэсцкай вобласці — 44, у Гомельскай — 59 і ў Магілёўскай — 46.**

Таксама, паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у Беларусі на 1 ліпеня пражываюць 10 082 ветэраны Вялікай Айчыннай вайны (у тым ліку і інваліды Вялікай Айчыннай вайны). Больш за ўсё іх налічваецца ў сталіцы — 2707 чалавек.

У нашай краіне налічваецца 17 429 былых вязняў фашызму і 688 інвалідаў з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд вайны або з наступствамі баявых дзеянняў.

Для ўсіх іх, а таксама адзінокіх пажылых людзей і інвалідаў І і ІІ групы ў першым паўгоддзі традыцыйна былі праведзены абследаванні ўмоў жыцця. Пры неабходнасці была аказана дапамога з рамонтам кватэр, дамоў, гаспадарчых пабудоў, устаноўлены пажарныя апавяшчальнікі, аказана матэрыяльная дапамога.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Парламент Ізраіля аднагалосна прыняў закон аб святкаванні Дня Перамогі 9 мая



З адпаведнай заканадаўчай ініцыятывай раней выступіў дэпутат ад партыі «Наш дом Ізраіль» Адэд Фарэр. У прэс-службе партыі адзначылі, што, нягледзячы на штучна створаныя перашкоды на шляху прасоўвання законапраекта з боку прадстаўнікоў некаторых партый, ён быў прыняты ў беспрэцэдэнтна кароткія тэрміны — за чатыры месяцы. Сярод асноўных палажэнняў прынятага законапраекта: вылучэнне часу ў раскладах школ і вайсковых часцей на вывучэнне тэмы перамогі над фашызмам, выдзяленне сродкаў мясцовым органам улады на работу па ўшанаванні памяці аб Перамозе. З гэтага часу, згодна з законам, 9 мая ў Ізраілі будзе адзначацца ўрачыстым пасяджэннем кнесета, дзяржаўнай цырымоніяй па лініі мясцовага ўрада і шэсцем у Іерусаліме. Святкаванне Дня Перамогі 9 мая адпаведнае традыцыям былога СССР і адрозніваецца ад практыкі заходніх краін, дзе разгром фашысцкай Германіі адзначаюць 8 мая.

### Еўрапейскі суд прызнаў, што квоты на бежанцаў справядлівыя

Іск Венгрыі і Славакіі аб незаконнасці сістэмы квот на бежанцаў варта адхіліць — з такой заявай выступіў прадстаўнік Еўрапейскага суда. Гаворка ідзе пра іск 2015 года, калі Будапешт і Брацілава выступілі супраць абавязковых для кожнай краіны ЕС квот на прыём мігрантаў. Пазней да іх далучылася Польшча. Аднак суд палічыў, што наяўная сістэма «адпавядае пастаўленым перад ёй задачам» — знізіць ціск на Італію і Грэцыю, якія ўжо некалькі гадоў прымаюць каласальную колькасць нелегалаў.

### Міністры працы і занятасці краін БРІКС прынялі сумесную дэкларацыю




Гэта адбылося па выніках сустрэчы ў горадзе Чунцыне (КНР). Асноўны акцэнт зроблены на стварэнні працоўных месцаў, фармалізацыі рынкаў працы і сацыяльнай абароне. Асаблівая ўвага ў дэкларацыі ўдзелена пытанню новых формаў занятасці. Акрамя гэтага, адным з галоўных інструментаў па барацьбе з беднасцю міністры назвалі развіццё прафесійных навыкаў на працягу ўсяго жыцця. Дэкларацыя змяшчае палажэнні, якія датычацца сацыяльнага забеспячэння грамадзян, у тым ліку ўцягнутых у нестандартныя формы занятасці. Дэкларацыя будзе прадстаўлена лідарам краін БРІКС на саміце ў горадзе Сямэнь у Кітаі, які пройдзе ў верасні.

### Брытанія адмовіцца ад аўтамабіляў на бензіне і дызелі

Вялікабрытанія ўслед за Францыяй плануе ў мэтах барацьбы з забруджваннем паветра з 2040 года забараніць продаж новых аўтамабіляў, якія працуюць на бензіне або дызельным паліве. Як сказаў міністр па справах навакольнага асяроддзя Майкл Гоў, да 2050-га на дарогах не павінна застаца машын на бензіне або дызпаліве. Брытанскія ўлады плануюць выдзеліць 255 мільёнаў фунтаў на распрацоўку схем, якія памяншаюць выкіды рухавікоў на дызельным паліве. Усяго на праграмы, накіраваныя на паляпшэнне якасці паветра, будзе выдаткавана 3 млрд фунтаў.

■ Новыя крокі

# АРВ-тэрапія для ўсіх ВІЧ-інфіцыраваных

**У краіне пачалі дзейнічаць новыя пратаколы па дыягностыцы і лячэнні ВІЧ-інфекцыі. Універсальны доступ да лячэння, якое павінен атрымліваць кожны, у каго выяўлена інфекцыя, стварае ўмовы для дасягнення мэт устойлівага развіцця, перамогі над СНІДам да 2030 года.**



Аб'яднаная праграма ААН па ВІЧ/СНІДзе (ЮНЭЙДС) некалькі гадоў таму прапанавала краінам свету стратэгію дасягнення ў 2020 годзе трох «90». 90 працэнтаў людзей, якія жывуць з ВІЧ, павінны ведаць пра свой статус, 90 працэнтаў людзей, якія ведаюць свой статус, павінны атрымліваць антыэтравірусную тэрапію, і ў 90 працэнтаў з ліку тых, хто атрымлівае лячэнне, павінна назірацца зніжэнне вірусная нагрузкі. Калі дасягнуць гэтых 90-90-90, то можна знізіць колькасць новых выпадкаў на 75 працэнтаў, што фактычна азначае прыпыненне эпідэміі СНІДу, пераход да этапу выяўлення адзінкавых выпадкаў захворвання. Такой амбіцыйны мэты ўжо дасягнулі Батсвана, Камбоджа, Сінгапур, Данія, Швецыя, Вялікабрытанія, Ісландыя і Паўночная Ірландыя. Шэраг рэгіёнаў, у тым ліку Заходняя і Цэнтральная Еўропа, Паўночная і Лацінская Амерыка, вельмі блізкія да сваіх перамог. А вось Усходняя Еўропа і Цэнтральная Азія пакуль не могуць гэтым пахваліцца. Тым не менш Беларусь істотна вылучаецца ў сваім рэгіёне — наша краіна дасягнула, напрыклад, выдалення перадачы ВІЧ-інфекцыі ад маці дзіцяці, што ўдалося ўсяго трох краінам у сістэме СААЗ.

— Па нашых падліках, у Беларусі з ВІЧ жывуць каля 30—35 тысяч людзей, але не ўсе яны ведаюць аб сваім статусе, — кажа **першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Нам неабходна дасягнуць максімальнага ахопу тэсціраваннем. Таму з мая ў аптэках Гомельскай вобласці пачалася рэалізацыя экспрэс-тэстаў на ВІЧ па сліне. Вопыт самататэсціравання будзе прааналізаваны і распаўсюджаны на ўсю Беларусь...

Такая магчымасць прызначана ў першую чаргу для тых катэгорый насельніцтва, што па нейкіх прычынах не ідуць абследавацца ў дзяржаўныя ўстановы аховы здароўя. Следам за саматэсціраваннем разам з тымі ж грамадскімі арганізацыямі будуць пашырацца і кансультацыйныя паслугі, паколькі ведаць дыягназ неабходна, зразумела, не проста дзеля ведання. Яшчэ ў 2015 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла, што лячыць з дапамогай антырэтравіруснай тэрапіі неабходна кожнага, каму пастаўлены дыягназ. І пачынаць трэба як мага хутчэй. Такім чынам, былі знятыя крытэрыі для прызначэння тэрапіі, ранні пачатак якой спрыяе паляпшэнню здароўя інфіцыраваных, зніжэнню смяротнасці і рызыкі перадачы віруса партнёру.

Цяпер антырэтравірусную тэрапію ў Беларусі атрымлівае каля 8 тысяч чалавек, а інфекцыя выяўлена ў 18 тысяч. Ахапіць усіх немагчыма было ў тым ліку з-за высокага кошту лячэння. Аднак дзякуючы супрацоўніцтву з міжнароднымі арганізацыямі кошт закупак такіх прэпаратаў будзе зніжацца, а шэраг з іх (для дарослага насельніцтва) ужо вырабляецца айчыннымі фармвытворцамі.

Тым часам тыя, хто практыкуе рызыкоўныя паводзіны, напрыклад, ужывае наркотыкі, могуць звярнуцца па дапамогу ў такую грамадскую арганізацыю, як «Пазітыўны рух», дзе дадуць неабходную інфармацыю абсалютна ананімна — не пытаючыся пра пашпарт і прозвішча. Руку дапамогі працягваюць ахвотна, бо выдатна разумеюць, што залежнага ад наркотыкаў вельмі няпроста матываваць не толькі на абследаванне на ВІЧ, але і на пажыццёвае ўжыванне лекаў, пропуск прыёму якіх лічыцца недапушчальным.

Стратэгію ЮНЭЙДС з 2015 года ў краіне актыўна прасоўвала ў якасці пасла добрай волі тэлевядучая і актрыса Святлана Бароўская. У наступныя два гады яна працягне гэту місію.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Надвор'е

# На выхадныя абяцаюць лета

**Спякотнае надвор'е з ападкамі прагназуецца ў Беларусі ў найбліжэйшыя дні. Пра гэта паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Тэмпературны фон ужо вярнуўся ў кліматычнае рэчышча, а ў апошнюю дэкаду ліпень "верне" ўпушчанае ў першай палове месяца цяпло. Нарэшце прагрэлася вада ў вадаёмах: у Бярэзіне, Дняпры, Прыпяці і Сожы — да 23 градусаў, у Заходняй Дзвіне, Нёмане і Вілейскім вадасховішчы — да 21, у Нарачы — да 20, у Заслаўскім вадасховішчы — да 19.**



Сёння, у пятніцу, ноччу па Гомельскай і Магілёўскай абласцях, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, на паўночным усходзе — моцныя. Днём пад уплывам няўстойлівых паветраных мас балтыйскага паходжання ў асобных раёнах рэспублікі не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў, а месцамі прагрымяць навальніцы. Уначы тэмпература паветра складзе ад 11 да 18 градусаў цяпла, удзень — ад 20 да 25.

Заўтра ноччу надвор'е ў краіне ўсё яшчэ будзе вызначаць франтальнымі раздзеламі. На большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы, на паўночным усходзе — ізноў моцныя. Удзень няўстойлівыя паветраныя масы з Балтыкі прынясуць кароткачасовыя дажджы ў асобныя раёны рэспублікі. Месцамі чакаюцца навальніцы. Ноччу слупок тэрмометра будзе знаходзіцца на ўзроўні ад 11 да 18 цяпла, днём паветра прагрэецца да 20—25.

У нядзелю тэрыторыя краіны акажацца пад уздзеяннем сфарміраванага ў цёплай паветранай масе антыцыклона з цэнтрам на поўдні Украіны. Будзе пераважна без ападкаў. Ноччу ў асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература ўначы складзе 11—16 градусаў, удзень — 22—28, а на Брэстчыне слупок тэрмометра можа дасягнуць адзнакі «+30».

Паводле папярэдняга прагнозу, апошнія дні ліпеня будуць цёплымі. У панядзелак пад уплывам атмасфернага фронту ноччу па заходніх раёнах краіны, а днём па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. На паўднёвым усходзе будзе без ападкаў. Уначы 15—20 градусаў цяпла, днём — 25—30. А на поўдні краіны прагназуюць сапраўдную спёку — да плюс 32. Першы дзень жніўня абяцае таксама быць цёплым, але зноў з дажджамі і навальніцамі. Тэмпература ўначы — 16—22 цяпла, удзень — 25—31. На поўдні чакаецца да 34 са знакам «плюс».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# Сям'ю года выберуць у тэатры

**Фінал рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года — 2017» пройдзе ў Мінску 27 кастрычніка, паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК. За прызавое месца будуць змагацца пераможцы з рэгіёнаў. Сёлета гэта ў асноўным поўныя сям'і з трыма дзецьмі.**

Фінал конкурсу пройдзе ў Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача. Удзельнікам трэба будзе прадставіць візітную картку сям'і «Радавод». А таксама — сацыяльна значны праект, у якім неабходна адлюстраваць сваё бачанне вырашэння актуальных праблем, звязаных з экалогіяй, выхаваннем дзяцей, падтрыманнем парадку на зямлі і інш.

«Мы распрацоўваем насычаную культурна-забаўляльную праграму для сем'яў, якія сталі найлепшымі ў сваіх рэгіёнах, каб удзел у конкурсе для іх стаў сапраўдным святам», — адзначыў Аляксандр Румак. Ён падкрэсліў, што рэспубліканскі конкурс праводзіцца трэці раз і накіраваны на павышэнне ролі і прэстыжу сям'і ў грамадстве, прасоўванне ідэй адказнага бацькоўства. «Сям'я — найважнейшы інстытут грамадства, апора дзяржавы. У ёй закладваецца падмурак маральнага выхавання чалавека, яго культурнага развіцця, фарміруюцца нормы паводзін, раскрываюцца ўнутраны свет і індывідуальныя якасці асобы».

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

# Трацім больш, чым зарабляем?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Крамы рэагуюць на гэта шматлікімі зніжкамі і распродажамі, у тым ліку на рэгулярнай аснове, як у сталічных універмагах. Трэба адзначыць, што і колькасць зарэгістраваных рэкламных гульняў павялічылася ў два разы.

Сем аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу адкрыта за першыя паўгода. Цяпер у Беларусі забяспечанасць па колькасці аб'ектаў харчавання на дарогах складае ў сярэднім адзін аб'ект на 28 км (пры нарматыве адзін на 30—50 км).

Індэкс спажывецкіх цэн за студзень — чэрвень 2017-га ў параўнанні са снежнем 2016-га склаў 103,4%. Гэта ніжэй за прагназаваны ўзровень, вызначаны ўрадам. Ірына Наркевіч адзначыла, што наладжаны сістэмны маніторынг узроўню цэн у краіне.

Тым часам адбылося пэўнае падзенне продажу на рынках і ў гандлёвых цэнтрах — 96,7% да ўзроўню першага паўгоддзя 2016-га. Намеснік міністра тлумачыць, што гэта адбылося з-за таго, што дробным гандлярам і індывідуальным прадпрымальнікам было складана выканаць тэхнічны рэгламент, які быў уведзены.

За гэты час колькасць гандлёвых аб'ектаў павялічылася на 3,6% і перавысіла 100 000. Існуе пэўная тэндэнцыя да павелічэння сеткавых крам: цяпер яны складаюць 65,3% ад агульнай колькасці. Такі рост дае добры паказчык забяспечанасці гандлёвымі плошчамі — ён складае амаль 700 $м^2$ на 1000 чалавек. Да таго ж на 1 ліпеня зарэгістравана больш за 15 000 інтэрнэт-крам, прырост да пачатку года — 9,8%. Гандаль застаецца інвестыцыйна прывабнай сферай. Прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове па секцыі G («Аптовы і рознічны гандаль, рамонт аўтамабіляў і матацыклаў») за студзень — сакавік 2017-га склалі $101,7 млн.

## БЕЗ СТРАТ І ЯКАСНА

Як адзначае Ірына Наркевіч, задача нумар адзін для ўрада, чыноўнікаў і мясцовых органаў — высветліць, як забяспечыць на вёсцы даступнасць якасных спажывецкіх паслуг. У Беларусі сельскае насельніцтва складае 22%, пры гэтым прыкладна кожны трэці — пенсіянер. Цяпер ідзе трансфармацыя падыходаў: як выйсці на бясстратнасць, але якасна абслужыць гэтую частку насельніцтва? МАРГ падрыхтаваў праект указа, накіраванага на развіццё прадпрымальніцтва ў малых гарадах і сёлах. Ён прадугледжвае пэўныя прэферэнцыі для тых, хто плануе развіваць бізнес у малых населеных пунктах.

Да таго ж Міністэрства ўдзяляе шмат увагі ўдасканаленню «правілаў гульні» бізнесу, каб канкурэнцыя была добрасумленная, а ўмовы — прывабныя. Гэта датычыцца і скарачэння лішніх адміністрацыйных патрабаванняў да прадпрымальнікаў, каб і займацца бізнесам, і ўваходзіць у яго было прасцей. Акрамя таго, МАРГ з удзелам усіх зацікаўленых вядзе распрацоўку праграмы развіцця канкурэнцыі ў Рэспубліцы Беларусь на пяцігадовы перыяд.

Да канца гэтага года Міністэрства падрыхтуе праект абноўленага закона аб дзяржрэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання. «Мы разглядаем правапрымяняльную практыку, якая была да гэтага часу сфарміравана, вывучаем міжнародны вопыт», — падзялілася Ірына Наркевіч. Адна з задач — забяспечыць шырокі асартымент пераважна айчынных тавараў у крамах.

Паводле праекта абноўленага закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», плануецца, што прадавец цяпер не зможа патрабаваць пашпарт у пакупніка пры вяртанні грошай за тавар. Да таго ж будзе немагчыма ўстанавіць розныя цэны на тавар у залежнасці ад формы аплаты. Тэрмін гарантыйнага рамонту збіраюцца павялічыць з 14 дзён да 30, каб у выканаўцы была магчымасць заказаць дэталі і якасна выканаць работу. Важную ролю ў абароне правоў спажыўцоў іграюць выканкамы, куды звяртаюцца людзі з пэўнымі праблемамі.

## ЗНОЎ У ШКОЛУ

Да канца жніўня ў краіне будуць працаваць больш за 180 пастаянна дзеючых школьных базараў. Дадаткова арганізаваны 475 школьных кірмашоў у выхадныя дні. Запланавана правесці амаль 2000 выставак-продажаў і пашыраных продажаў тавараў школьнага асартыменту.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Рэгіён

# А ГОРАД ПАДУМАЎ — ВУЧЭННІ ІДУЦЬ

**Подзвіг, які быў здзейснены ў небе над Гомелем 25 гадоў таму, цяпер занатаваны і на памятнай дошцы. Яна прысвечана лётчыку Віктару ОСЬКІНУ і адкрыта на вуліцы, якая носіць імя гэтага мужнага чалавека.**

У канцы ліпеня 1992-га самалёт «Ту-22У», экіпажам якога кіраваў падпалкоўнік Віктар Оськін, падняўся з аэрадрома «Зябраўка», каб здзейсніць чарговы палёт. На другой хвіліне высветлілася, што загарэўся правы рухавік, задні паліўны бак, а потым і другі рухавік. Самалёт пачаў імкліва губляць вышыню якраз над Навабеліцкім раёнам горада над Сожам. Пасля таго як лётчыкі адвялі машыну на бяспечную адлегласць ад жылых раёнаў, камандзір судна Оськін аддаў загад катапульціравацца.

Аляксандр Сцепчанкоў, які быў у складзе экіпажа разам са штурманам Мікалаем Івановым, расказвае, што яны ўдвух выканалі загад. Камандзір у гэты момант ацаніў сітуацыю і зразумеў, што самалёт падае якраз на нафтабазу, і прыняў рашэнне адвесці бяду ў лясны масіў. Гэтыя некалькі секунд і каштавалі яму жыцця, але выратавалі ад куды большай трагедыі. Самалёт разбіўся ў лесе за 96 метраў ад чыгункі і за 400 метраў ад склада гаручага. Парашут Оськіна не раскрыўся з-за нізкай вышыні.

Кіраўнік адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля Сяргей Казачок падкрэсліў на ўрачыстым адкрыцці дошкі, што памяць пра выдатны подзвіг Героя Расійскай Федэрацыі будуць захоўваць жыхары самага маладога 104-га мікрараёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# КУПІЦЬ УСЁ ДА ШКОЛЫ


Фота БЕЛТА.

## ДЛЯ ХЛОПЧЫКАЎ І ДЗЯЎЧЫНКІ...

У мяне два сыны-школьнікі: старэйшы пойдзе ў 7-ы, а малодшы — у 4 клас. Іх мама ва ўласцівай ёй манеры прысароміла, што за столькі гадоў не вывучыў «школьны асартымент». Але пагадзілася стаць адным з экспертаў і кансультантаў для падрыхтоўкі матэрыяла.

Адразу папярэджваю, што пералічанае ў цэнах — выбар канкрэтнай жанчыны. Безумоўна, усё залежыць ад густу, дастатку, месца жыхарства. Наўрад ці жыхары пасёлка будуць поўнасцю задаволены выбарам у мясцовай краме. Многія спецыяльна прыедуць у вялікія гарады. Ніжэй прыведзена цана школьнага набору ў Віцебску.

Заплечнік сёлета каштуе 55—65 рублёў, але выбар багаты. Гэту рэч можна купіць і за 80 рублёў, і значна даражэй. Штаны — каля 40 рублёў, але можна знайсці як танней, так і даражэй. Камізэлька — каля 30 рублёў. За пінжак айчыннай вытворчасці трэба аддаць 60 рублёў або можна знайсці танней. Кашуля — каля 30 рублёў (звычайна купляюць дзве). Чаравікі — ад 60. Зменны абутак — 15 рублёў. Многія замест яго купляюць красоўкі — 45 рублёў і даражэй. Спартыўны касцюм — ад 50.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наконт канцылярскіх тавараў: сшыткі, пенал, ручкі, алоўкі, альбом для малявання, пластылін — прыкладна 15—20 рублёў.

У выніку, па самых сціплых падліках, на аднаго школяра трэба выдаткаваць каля 430 рублёў. Памножце на два.

Плюс за карыстанне падручнікамі трэба плаціць у пачатку навучальнага года. Кошт залежыць ад класа, у які ходзіць школьнік. Летась за падручнікі для дваіх заплацілі каля 20 рублёў.

Успомнім, што будуць выдаткі на харчаванне ў школе. Не трэба забываць пра платныя гурткі, якія наведваюць многія дзеці. Малодшы мой ходзіць у падрыхтоўчую групу танцавальнага калектыву, і штомесяц я плачу каля 30 рублёў. Старэйшы вучыцца ў мастацкай школе. І да пачатку канікул заплацілі каля 12 рублёў.

У сястры малодшая дачка пойдзе ў 5-ы клас. Цэны ад яе:

Спадніца — ад 40 рублёў, сукенка — 60—65 рублёў, сарафан — ад 35, штаны — 30 і больш, блузка — каля 20, туфлі скураныя — ад 70, спартыўны касцюм — ад 50 рублёў... Ужо 310 рублёў. Плюс заплечнік і тое, што туды, атрымаецца мінімум 450. Так, насамрэч дзяўчынкі «каштуюць даражэй».

Пра «амуніцыю» для гімназістаў. Хочаш не хочаш, а прыйдзецца купіць пінжак, штаны, спадніцу менавіта канкрэтнага выгляду. Або прыйдзецца заказваць гэтую форму разам з іншымі бацькамі. Як пажартаваў бацька гімназіста: «Калісьці бацькоўскіх сходаў баяліся дзеці (каб не каралі дома, калі настаўнік нешта негатыўнае выказа), цяпер — бацькі (бо трэба абавязкова нешта купляць, скідвацца на «агульныя патрэбы»).

## У ІНТЭРНЭЦЕ, НА РЫНКАХ...

Наконт школьных кірмашоў мае суразмоўцы былі скептычныя. Шмат сэканоміць там не атрымаецца. Вытворцы не ідуць на значнае зніжэнне цэн. Спрацоўвае маркетынгавы ход: бацькам зручна купіць усё ў адным месцы. Але ж наўрад ці магчыма падабраць пад густ сынам і дочкам там і абутак, і адзенне, не гаворачы пра заплечнікі і іншае. Летась, калі не памыляюся, у Віцебску кірмашы пачалі працаваць толькі ў жніўні.

У крамах, якія зацікаўлены ў добрай рэалізацыі перад пачаткам навучальнага года, робяць скідкі для шматдзетных сем'яў. Але, як заўважаюць вопытныя бацькі, нацэнкі там звычайна большыя. Вось і думайце.

Знаёмы тата параіў пашукаць неабходнае для школы ў інтэрнэт-крамах. Насамрэч, некаторыя тавары таннейшыя працэнтаў на 15—20. А многія на ўзроўні крамаў.

Што датычыцца рынкаў, на мой суб'ектыўны погляд, іх перавага толькі ў тым, што гандляры могуць скінуць цану. Але... Падзялюся асабістым негатыўным вопытам. Летась на рынку купіў красоўкі. Гандляр чэк не выдаў, затое скінуў 5 рублёў, у выніку абутак абышоўся ўсяго за 20. Насі і радуйся. Аднак літаральна ў першы дзень адчуў, што пяткам няўтульна. Праз некалькі дзён боль перашкаджаў хадзіць. Праз тыдзень падняў вусцілку: сярэдняя падэшва, якая павінна забяспечваць устойлівасць нагі і амартызаваць удары і нагрузкі, была зроблена з... жорсткага пластыку. Сумняваюся, што гэты тавар меў сертыфікат якасці.

## А Ў СОЧЫ... ТАННЕЙ

Знаёмы адзеў сына сямікласніка да школы ў... Сочы, дзе жывуць сваякі. Гэта абышлося танней, чым у нас, прыкладна на 40%. Аказалася, што ў многіх гарадах Расіі ёсць фірмавыя кропкі, дзе цана аднолькавая, незалежна ад рэгіёна. У прыватнасці, кашулю можна купіць за 300—400 расійскіх рублёў, майку — за 200. Штаны — за 600 расійскіх. Памножце на курс (0,0326) і зразумееце, што насамрэч цана прывабная. Але новыя калекцыі адзення дарагія. Ды і якасць часта саступае аналагічным таварам беларускай вытворчасці.

Жыхары Віцебска, якія імкнуцца эканоміць, едуць па пакупкі ў суседні Смаленск. Там таксама можна адзець і абуць дзіця і да таго ж купіць ежу. Да расійскага абласнога цэнтра 120 кіламетраў. Смаленскі гіпермаркет нават прадастаўляе бясплатны міжнародны аўтобусны трансфер. Праўда, перад паездкай назад трэба паказаць чэк на тавары ў краме, эквівалентны па цане білету на праезд у звычайным аўтобусе.

Каб неяк падтрымаць сваіх супрацоўнікаў, некаторыя прадпрыемствы Віцебшчыны заказваюць «колы» па пакупкі ў Смаленск. Калі ехаць туды на сваім аўто, на паліва спатрэбіцца 10 еўра ў эквіваленце. Плюс столькі ж трэба будзе аддаць за страхоўку машыны. Плюс чаргі ў гатэлі каля аўтавакзала (танней, чым у аналагічным нумары ў Віцебску).

Дарэчы, пры ўсіх мясцовых «плюсах» расіяне вельмі паважаюць нашы тавары. Быў нядаўна ў Смаленску і бачыў чэргі ў крамах і павільёнах, дзе гандлююць беларускім асартыментам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Справы жыллёвыя

# САБЕКОШТ КАМУНАЛЬНЫХ ПАСЛУГ ЗНІЖАЕЦЦА

## А працэнт іх аплаты жыхарамі расце

**Мадэрнізацыя кацельных, своечасовая замена цепласетак, зніжэнне падаткаў — гэтыя і іншыя прапановы для аптымізацыі работы прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі і зніжэння сабекошту іх паслуг агучылі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Беларусі на калегіі, праведзенай разам з урадам і мэрамі абласцей краіны па даручэнні Прэзідэнта.**

### Каб не вылецець у трубу

Работа ЖКГ, абласных выканкамаў і Мінгарвыканкама па зніжэнні затрат на паслугі ЖКГ была прызнаная недастатковай, выяўлены шматлікія парушэнні і недахопы. Большасць правапарушэнняў сферы — злоўжыванні, крадзяжы, хабарніцтва — сістэмныя і маюць карупцыйную накіраванасць, падкрэсліў **Юрый МЯХЕДАЎ, начальнік упраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю.** Многія прадпрыемствы дагэтуль працуюць затратна, разлічваючы на кампенсацыю з бюджэту. Яны не толькі не зніжаюць выдаткі на аказанне жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП), але і завышаюць іх цану, працуючы з пасрэднікімі структурамі.

— У арганізацыях ЖКГ працягваюць выяўляць факты нерацыянальнага карыстання матэрыяльнымі грашовымі рэсурсамі, маніпуляцыі пры фарміраванні сабекошту паслуг, бескантрольнасці пры закупках і карыстанні дзяржаўнымі сродкамі, — расказаў **старшыня Камітэта дзяржкантролю Леанід АНФІМАЎ.** — Самае сумнае, што знаходзіцца дзялкі (прадстаўнікі і кіраўнікі прадпрыемстваў на мясцовых узроўнях), што спрабуюць рабіць бізнес на грашах, якія дзяржава знаходзіла нават у самыя складаныя часы, каб дапамагчы народу не аддаваць апошняе для аплаты камунальных плацяжоў.

Звышнарматыўныя страты і значны перарасход адбываюцца не толькі праз злачынствы, а і праз звычайную безгаспадарчасць. Так, паліва (дровы і шчапа) часта захоўваецца пад адкрытым небам. Праз гэта расход адсырэлай сыравіны павялічваецца на 65%, а каэфіцыент карыснага дзеяння катлоў змяншаецца на трэць. «Загатоўка паліва ўласнымі сіламі прадпрыемстваў ЖКГ дазволіць на 20% знізіць выдаткі на яго закупку, а таксама вырашыць пытанне якасці драўніны», — упэўнены **Станіслаў НАРКЕВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за работай галін сферы матэрыяльнай вытворчасці Камітэта дзяржкантролю.**

Вялізная колькасць рэсурсаў губляецца і праз незадавальняючы стан цеплісетак. У Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцях амаль трэць такіх камунікацый працуе больш за нарматыўны тэрмін (звыш 25 гадоў), і, нягледзячы на высокі знос, запланаваныя аб'ёмы іх замены не выконваюцца.

— Перавышаны ўстаноўлены тэрмін службы і ў больш як 30% сістэм водазабеспячэння, праз што летась страты ў сістэме водазабеспячэння ў краіне склалі 18%. А пры тэмпах замены і рамонту зношаных водаправодаў не больш за 1% у год ад той колькасці, якая падлягае аднаўленню, спатрэбіцца не менш як паўстагоддзя, каб пазбавіцца ад старых сетак, — дадаў ён.

Старшыня КДК падкрэсліў, што зніжэнне затрат у арганізацыях ЖКГ — прыярытэтная задача, якую павінна вырашаць уся ўладная вертыкаль, пачынаючы ад Саўміна да старшынь райвыканкамаў:

— Пэўную нагрузку па аплаце камунальных паслуг павінна несці і насельніцтва, але ў разумных межах. За апошнія пяць гады пытанне абгрунтавання фарміравання сабекошту камунальных паслуг для жыхароў вывучалася двойчы, выяўлены значныя рэсурсы па іх зніжэнні.

### Перагледзець, ліквідаваць, спыніць

Летась, пасля рэалізацыі прапаноў КДК па зніжэнні затрат на аказанне ЖКП, удалося паменшыць іх на 16,5% і сэканоміць такім чынам 267 млн рублёў. Сярод сёлетніх прапаноў па далейшым памяншэнні затрат — мадэрнізацыя і ліквідацыя неэфектыўных кацельных. Магутнасці 310 з іх у краіне значна перавышаюць далучаную нагрузку, а сабекошт цеплаэнергіі на некаторых перавышаны ў 3—6 разоў.

Неабходна змяніць і зрабіць больш празрыстай нарматыўную базу па фарміраванні тарыфаў у сферы абароту цвёрдых камунальных адходаў. КДК прапануе стварыць гранічны тарыф (з улікам рэгіянальных асаблівасцяў) па гэтай паслузе ў разліку на аднаго чалавека.

Трэба перагледзець і падыход да фарміравання падаткаў на нерухомасць і зямлю. Да арганізацый ЖКГ часта прымяняецца завышаны каэфіцыент, што таксама вядзе да павелічэння сабекошту паслуг, расказаў **Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю.**

Паспрыяе зніжэнню затрат на ЖКП і спыненне перадачы на баланс прадпрыемстваў ЖКГ няпрофільных аб'ектаў (часта разам з іх даўгамі, што пакрываюць камунальнікі), на ўтрыманне якіх не выдаткоўваюцца сродкі.

— Калі ўсе нашы сёлетнія прапановы па зніжэнні затрат на аказанне камунальных паслуг будуць рэалізаваны, то на працягу двух гадоў гэтыя выдаткі зменшацца на 220 млн рублёў, а сабекошт ЖКП знізіцца на 7,5%. Гэта дазволіць значна паменшыць расходы насельніцтва на іх аплату, — рэзюмаваў Уладзімір Кухараў.

Гэта, аднак, не азначае зніжэння лічбаў у «жыроўках». «Рэалізацыя рэкамендацый КДК дазволіць павысіць складнік затрат насельніцтва на ЖКП», растлумачыў намеснік старшыні. Як вядома, у 2015-м памер пакрыцця камунальных паслуг жыхарамі складаў 30%, сёлета — каля 60% (на канец 2017-га, плануецца, ён падрасце да 65%). У канцы 2018-га кампенсацыя кошту ЖКП жыхарамі (без уліку паслуг цеплавога забеспячэння і гарачага водазабеспячэння) дасягне 100%. Цяпер насельніцтва аплачвае цеплавыя паслугі прыкладна на 18% ад іх рэальнага кошту. Менавіта ў гэтай сферы спецыялісты бачаць самы вялікі рэзерв для зніжэння затрат і памяншэння аплаты гэтых паслуг.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Ёсць нагода

# Мадэлюючы рэальнасць

**Сёлета споўнілася 25 гадоў брытанскаму рэаліці-шоу «Survivor» («Ацалелы»), якое пад рознымі назвамі і з шалёнымі рэйтынгамі скарыла больш як 50 краін свету. У нас яно больш вядома пад назвай «Апошні герой», шэсць сезонаў якога зладзіў і паказаў расійскі Першы канал. Мяркую, многія добра памятаюць гэты жорсткі фармат: бязлюдны востраў у адной з экзатычных краін і пара дзясяткаў удзельнікаў, якім неабходна амаль з нічога арганізаваць сабе жытло, побыт, харчаванне, а паралельна выконваць шэраг няпростых заданняў арганізатараў і «з'ядаць» самых слабых удзельнікаў «племені».**


«Ацалелы».

Нягледзячы на ўсе жарсці і выпрабаванні, праект меў надзвычайную папулярнасць — саўндтрэк «Апошні герой» ад гурта «Бі-2» рваў хіт-парады, а кастынгі на ўдзел у ім праходзілі дзясяткі тысяч чалавек, у тым ліку і мінчанка Ксенія Волкава, якая ў 2002 годзе стала ўдзельніцай рэаліці-шоу «Апошні герой-2» у Малайзіі, дайшла да фіналу і выйграла шэраг каштоўных прызоў...

З юбілейнай нагоды мы вырашылі ўспомніць і пра іншыя — самыя-самыя рэаліці-шоу, ад сусветна вядомых праектаў да ўласнабеларускіх знаходак.

## Самае першае

Перадачы з элементамі сучаснага рэаліці, якія паказвалі ўчынкі людзей у штучна створаных абставінах, набліжаных да жыцця, з'явіліся яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Так, у 1948 годзе адзін з тэлеканалаў ЗША прадставіў шоу «Схаваная камера», заснаванае на радыёперадачы «Схаваны мікрафон», — і там, і там запісвалася рэакцыя людзей, якіх сцэнарысты паставілі ў надзвычайныя сітуацыі.

Зрэшты, некаторыя даследчыкі тэлебачання называюць першым сапраўдным рэаліці-шоу іншую праграму — шматсерыйны дакументальны праект «Амерыканская сям'я» 1973 года, дзе сям'я Пэт і Біла Лаўдаў і іх пяцярых дзяцей з Санта-Барбары, штат Каліфорнія, праходзіла праз складаны працэс разводу.

## Самае папулярнае

«Вялікі брат» — менавіта так называецца рэаліці-шоу, якое ўваходзіць у тройку самых папулярных тэлепраектаў у свеце. Паводле афіцыйнай легенды, ідэю «таталітарнай антыўтопіі» змясціць некалькі ўдзельнікаў у ізаляваны дом, дзе яны пад пастаянным наглядам тэлекамер будуць выконваць жорсткія заданні нябачнага «вялікага брата», а таксама сварыцца, інтрыгаваць, скандаліць, кахаць і пакідаць праект па рашэнні тэлегледачоў, прыдумаў 50-гадовы галандзец Джон дэ Моль.


«Вялікі брат».

На сёння «Вялікага брата» паглядзелі ўжо звыш 2 мільярдаў чалавек амаль у 40 краінах, а аўтар ідэі зарабіў на шоу, паводле прыблізных падлікаў, звыш 5 мільярдаў долараў.

## Самае «доўгайграючае»

З мая 2004 года ідзе ў эфіры скандальнае расійскае рэаліці-шоу «Дом-2» (не блытайце з проста «Домам», дзе сапраўдныя сямейныя пары, у тым ліку беларусы Андрэй і Вольга Бярковы, насамрэч будавалі дом і разыгралі яго ў якасці галоўнага прыза! — **Аўт.**), якое ўвайшло ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самае працяглае шоу і, здаецца, даўно перакачавала з катэгорыі тэлепраектаў у лік сацыяльных з'яў.

Нягледзячы на сур'ёзную крытыку, шматлікія абвінавачанні ў амаральнасці і пратэсты грамадскіх актывістаў, дэпутатаў і прадстаўнікоў царквы, праект толькі змяніў час эфіру, але не закрыўся і не страціў рэйтынгі. За ўвесь час праз бясконцую «будоўлю дома і пачуццяў» прайшло больш за 1500 удзельнікаў і было згуляна амаль два дзясяткі вяселляў.

## Самае жывёльнае

«Сямейства Каташ'ян» — пад такой назвай у Ісландыі сёлета запусцілі рэаліці-шоу пра... насельнікаў кацінага прытулку. З аднаго боку, яго аўтары парадзіруюць гламурнае амерыканскае шоу пра Кім Кардаш'ян і яе сям'ю, з другога — прыцягваюць увагу гледачоў да праблемы кінутых жывёл. Шоу з кацянятамі стала адным з інтэрнэт-хітоў — паводле ацэнак гледачоў, глядзець на коцікаў куды больш прыемна, чым на ўсякіх «зорак».


«Сямейства Каташ'ян».

## Самыя скандальныя

У вялізным сямействе рэаліці-шоу ёсць дзівацкія, недарэчныя, а ёсць і проста шакіруючыя. У ліку апошніх — праект 2005 года маладзёжнага галандскага ТБ «Spuiten & Slikken» (самы нявінны пераклад гучыць як «Усунь і праглыні»). Яго вядучыя мусілі... ужываць наркотыкі і займацца сексам у прамым эфіры, а потым дзяліцца з гледачамі сваімі эмоцыямі і ўражаннямі. Пры тым прадзюсары шоу настойліва сцвярджалі, што яго задача — не забаўляць, а інфармаваць моладзь аб тым, якую рэакцыю на арганізм аказваюць розныя забароненыя рэчывы. Насуперак шматлікім акцыям пратэсту афіцыйна забараніць гэтае шоу і прыцягнуць яго стваральнікаў да адказнасці не ўдалося, і перадача трансліравалася цэлы год.

Або ўзяць брытанскае шоу 2003 года «Руская рулетка». Ілюзіяніст і экстрасэнс Дэран Браўн выбраў сярод 12 тысяч прэтэндэнтаў добраахвотніка, які зарадзіў рэвальвер адзінай куляй і ўгадваў, пацэліўшы то ў мяхі з пяском, то ва ўласную скроню, дзе знаходзіцца баявы патрон... Паліцыя заклікала адмяніць шоу, каб не справакаваць перайманьнікаў, але яно ўсё ж трапіла ў эфір.

## Самае спартыўнае

Сярод мноства тэлевізійных спаборніцтваў «Цудоўная сямёрка», створаная ў 2007 годзе беларускім тэлеканалам «Лад» (цяпер «Беларусь 2»), прыемна вылучаецца. Па-першае, гэта цалкам арыгінальная ідэя, а па-другое, у межах аднаго праекта розныя сямёркі ўдзельнікаў выпрабавалі сябе ў сямі відах спорту: гарналыжны спорт (перамагла спявачка Алеся), водныя лыжы (Вольга Барабаншчыкава), скалалажанне (біятланіст Вадзім Сашурын), картынг (кікбаксёрка Карына Аляксандрава), сінхроннае плаванне (тэлевядучая Алена Бікрэнева), конны спорт (спявак Аляксей Хлястоў) і біятлон (Алена Ланская). Пераможцу ў суперфінале праекта выбіралі не толькі па балах, але і па сімпатыях гледачоў і прэсы. Самым-самым, нагадаем, аказаўся пяціразовы чэмпіён свету па біятлоне Вадзім Сашурын.


«Цудоўная сямёрка».

На вялікі жаль, другі сезон «Цудоўнай сямёркі», запушчаны ў 2013 годзе, «не пайшоў», і праект зачыніўся пасля першага ж этапу.

## Самае вясковае

Дзясяткі тысяч беларусаў імкнуцца з'ехаць з вёскі ў горад, і адзінкі — наадварот, з горада ў вёску. Пазалетась маладзёжны тэлеканал «Беларусь 2» прадставіў унікальнае рэаліці-шоу «Панаехалі!», у якім 10 маладых гараджан чакаў «экстрым вясковага побыту» ў адной з вёсак Валожынскага раёна. Для выключна «гарадскіх штучак» нават адсутнасць звыклых выгод цывілізацыі і звыклая для вяскоўцаў фізічная праца — прапалоць грады, накасіць сена, затапіць печ, падаіць карову, пасячы дровы — аказалася сур'ёзным выпрабаваннем на трываласць. Пераможцай шоу тэлегледачы абралі, як ні дзіўна, дзяўчыну — мінчанка Алена Кірынюк потам і мазалямі зарабіла галоўны прыз — пуцёўку на дваіх на Канары...

Актуальны для нашых рэалій праект меў гучны поспех і добрыя рэйтынгі, а таму, запэўніваюць у Белтэлерадыёкампаніі, ён абавязкова атрымае працяг — ужо ў новым тэлесезоне!

...Безумоўна, на ТБ прыдумана безліч рэаліці-шоу, уключаючы кулінарныя («Званая вячэра», «Універ-шэф», «Пякельная кухня»), спаборніцкія (у шоу «Чалавек супраць звера», пакуль абаронцы жывёл не вымусілі закрыць яго, барэц сумо спаборнічаў з арангутанам у перацягванні каната, а індыйскі слон навыперадкі з 40 карлікамі цягнуў самалёт), беспрынцыпныя (удзельнікі нямецкага «Свінскага жыцця» некалькі тыдняў жылі ў хлеве і харчаваліся ледзь не памыямі, каб выйграць пару тысяч еўра) і зусім ужо дзівацкія (накшталт японскага «Цукерка ці не», дзе ежа можа быць бутафорскай, а прадметы інтэр'еру — ядомымі, або амерыканскага «Без твару», у якім грымёры ствараюць страшныя і агідныя вобразы). Але ў канчатковым выніку выбіраем мы з вамі — гледачы. І калі «вочы б вашы не глядзелі» на «Дом-2» — выключыце яго.


«Панаехалі!»


«Без твару».

**Фота з адкрытых крыніц і з архіва Белтэлерадыёкампаніі**

■ Тэлесеткі

# ПА ПАРАДКУ — РАЗЛІЧЫЛІСЯ

### Адбылася жараб'ёўка фіналістаў адбору на дзіцячае «Еўрабачанне-2017»



Праз месяц у самай вялікай студыі Белтэлерадыёкампаніі «600 метраў» пройдзе фінальны гала-канцэрт нацыянальнага адбору дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне», але жараб'ёўку канкурсантаў у медыяхолдынгу правялі загадзя.

Па выніках лёсавання ўдзельнікі выйдуць на сцэну ў наступным парадку:

1. Хелена Мерааі (Мінск); 2. Анастасія Цімафеевіч (Брэст); 3. Руслана Панчышына (Мінск); 4. Эліна Матарас (Мінск); 5. Яраслаў Саколікаў (Мінск); 6. Стафанія Сакалова (Мінск); 7. Дуэт Аліны Пехцеравай і Анастасіі Дзмітрачковай (Мінск); 8. Квартэт Нацыянальнага цэнтра дзіцячай творчасці імя У. Мулявіна: Максім Цупрыкаў, Ангеліна Ламака, Стафанія Круглая і Стафанія Сакалова (Мінск); 9. Марыя Жыліна (Мінск); 10. Анастасія Жабко (Мінск).

Акрамя таго, расказалі «Звяздзе» ў медыяхолдынгу, творчая група праекта сустрэлася з камандай кожнага юнага артыста, каб даць пэўныя парады і рэкамендацыі наконт дапрацоўкі песень, нумароў і сцэнічных вобразаў. Гэтыя кансультацыйныя сустрэчы і карэкціроўкі будуць праходзіць і надалей. У каго з удзельнікаў дамашняе заданне атрымаецца выканаць лепш за ўсіх — даведаемся 25 жніўня падчас гала-канцэрта. Тады ж гледачы змогуць ацаніць відэавізітоўкі ўсіх канкурсантаў (іх плануецца зняць на пачатку жніўня), у аздабленні якіх рэжысёр Юрый Ярошык абяцае зноў, як і ў дарослым конкурсе, выкарыстаць сімвалы беларускага арнаменту.

### Тым часам

Канчаткова вызначыліся даты і месца правядзення наступнага дарослага конкурсу «Еўрабачанне». Як указана на афіцыйным сайце, конкурс у 2018 годзе ўпершыню пройдзе ў сталіцы Партугаліі Лісабоне з 8 па 12 мая.

# КУЛЬТУРНЫ ТЫДЗЕНЬ З ЮБІЛЯРАМІ

### «Беларусь 3» адзначыць 100-годдзе Янкі Брыля і яшчэ шэраг круглых дат

**Наступны тыдзень стане вельмі насычаным на імяніны вядомых дзеячаў мастацтва, у гонар якіх сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў адмысловыя святочныя праграмы.**

Так, да 100-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка БССР Янкі Брыля яго вядомыя творы будуць чытаць у эфіры акцёры тэатра і кіно — у прыватнасці, у спецыяльных відэароліках прагучаць урыўкі з апавяданняў «Маці» і «Галя». Пра малавядомыя факты з жыцця і творчасці пісьменніка нагадае гледачам 4 жніўня перадача «Святло далёкай зоркі».

Зрэшты, аўтар і вядучы «Святла далёкай зоркі» Аляксандр Дамарацкі раскажа ў асобных серыях цыкла і пра іншых юбіляраў тыдня. 1 жніўня праграма будзе прысвечана 80-годдзю дырыжора Юрыя Яфімава, 2 жніўня — раскажа пра народную артыстку БССР, адну з дзвюх жанчын-дырыжораў Савецкага Саюза Таццяну Каламійцаву. 3 жніўня вядучы ўспомніць пра мастака Мікалая Селешчука, а 5 жніўня пагаворыць з гледачамі пра яркія ролі заслужанай артысткі БССР, актрысы Алімпіяды Шах-Парон, 95-годдзе з дня нараджэння якой святкуецца сёлета.

У нядзелю «Беларусь 3» адзначыць перад'юбілейны дзень нараджэння славутага беларускага кампазітара, народнага артыста СССР Ігара Лучанка — спецвыпускам праекта «Легенды беларускай эстрады», а таксама творчым вечарам «Неспакойнае сэрца».

Акрамя таго, увечары 6 жніўня заўзятыя тэатралы змогуць прычыніцца да святкавання 60-гадовага юбілею мастацкага кіраўніка Купалаўскага тэатра, лаўрэата Дзяржпрэміі Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтваў Мікалая Пінігіна. Менавіта ў яго ную творчую лабараторыю завітаюць тэлевізійнікі ў чарговым выпуску праграмы «Майстры і куміры», а крыху пазней тэлегледачы ўбачаць запіс спектакля «Сымон-музыка» ў пастаноўцы юбіляра

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*




## Пасля «...базару»

Чыстая праўда, але расказваць буду, як казку. Ну хоць бы пачну.

Жыў-быў адзін дырэктар. Гадкоў з дваццаць ужо пасаду займаў. Добры заробак меў і аўтарытэт, кватэру, машыну, жонку, дзяцей, нават дзвюх унучак прыждаў.

Падрасла, карацей, сям'я, цеснаю стала дача, і надумаў ён новую ставіць — вядома ж, «па сродках», з размахам.

А побач з ім суседка будавалася. Яна трохі меншы дамок сабе ўзводзіла, але ж таксама не шпакоўню, бо ўжо іншыя часы наступалі — не савецкія. Ды і маладзіца не з тых была, не з савецкіх: зграбная, увішная, да кожнага патрэбнае слоўца знаходзіла, да многіх — падыход...

Ну яно ж сапраўды: шчыруе экскаватаршчык на ўчастку дырэктара, капае катлаван пад два гаражы. А суседцы толькі траншэю пад падмурак трэба... Дык чаму б за адным «скрыпам» не выкапаць?

Тое ж з бульдозерам: дзе адзін участак, там і два... З пад'ёмным кранам — таксама: навошта яго двойчы ганяць?

І матэрыялы яны з розумам вазілі: першы рэйс цэглы — на будоўлю дырэктара, другі — на суседчыну. Гэта ж лёгка, а тым больш, калі ведаеш, што за ёй не заржавее, як той казаў, што яна, дзе быўшы, дырэктарскім унучкам гасцінцаў прывязе, з жонкай рэцэптамі падзеліцца, дзецям нешта параіць... Ідылія! Хоць і рухнула яна адным добрым летнім вечарам, на вачах.

А ўсё з-за чаго? З-за... «базару» — «Славянскага», самага першага.

Па тэлевізары, значыць, сталі яго адкрыццё паказваць. Сям'я дырэктара села глядзець, шкадуючы ўголас, што не ў поўным складзе, што гаспадар не дома, на жаль, што яго ў Варонеж у камандзіроўку адправілі.

А на экране тым часам то сцэну паказваюць, то публіку ў зале. Бывае — агулам, а бывае — асобнымі тварамі: апараты выбіраюць — найбольш каларытныя, нечым адметныя...

І раптам на пары спыняюцца: мужчына сталы такі, мажны, твар з лысінай чырвоны (ці то з гарачыні, ці то ад хвалявання)... Бо побач з ім — маладзіца (у дочкі гадзіцца), прыгожая, прыбраная. І туліцца да яго, і лашчыцца... Ну нібы тая котачка, калі смятанкі просіць...

Карацей — карціна алеем, на ўвесь экран!

Першым яе згледзеў зяць дырэктара.

— Во... Дык гэта ж..., — сказаў ён, бо пры дзецях ніколі не мацюкаўся.

А зрэшты, хто там што сказаў, хай кожны ўявіць сам. Факт, што канцэрт той глядзелі многія дачнікі, многія знаёмыя таго дырэктара. У тым ліку — непасрэднае начальства. І гэта сёння ў яго, так бы мовіць, мухі асобна, катлеты асобна (гэта значыць, асабістым жыццём падначаленых нізхто не цікавіцца), а тады яшчэ з моды не выйшла адпаведныя «меры прымаць».

Вось яно і прыняло: папрасіла дырэктара ціха сысці на пенсію.

Такім чынам не паспеў ён дачу дабудаваць — ні сабе, ні улюбёнай суседцы...

Але ж яна і сама неяк справілася. Ва ўсякім разе пра агароджу клопату не мела: суседзі — з усіх трох бакоў — самі яе паставілі, адгарадзіліся — хто дошкамі, хто бетонам...

Яе толькі плоцік быў — ад вуліцы, драўляны, нізенькі, бо што там хаваць, калі ўсе ўсё бачылі.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## Не рабі дурнога...

Пасля службы ў войску двое дружбакоў Пятро з Міколам разам паступілі ў сельскагаспадарчы тэхнікум, разам праз нейкі час трапілі на вытворчую практыку. Думалі, што яна ў майстэрнях пройдзе, бо вучыліся на механікаў, але ў калгасе захварэў адзін трактарыстаў, замяніць яго не было кім, вось старшыня і папрасіў студэнтаў дапамагчы на пасяўной.

Тыя адмаўляцца, вядома ж, не сталі, бо які-ніякі досвед работы на тэхніцы ў абодвух быў, жаданне зарабіць трохі грошай — таксама. У выніку стварылі экіпаж: Пятро кіраваў трактарам, Мікола — «стаяў» на сеялцы, потым — мяняліся месцамі і выдавалі штодня па паўтара, а то і па дзве нормы.

Але ж вось яно апошняе поле, канец пасяўной. «Вечарам гэта можна «абмыць», — падумалі практыканты. А як, калі па ўсім відаць, што праца завершыцца позна, што крама тады будзе зачынена... Значыць, пра выпіўку трэба паклапаціцца загадзя?

Гэта ў студэнтаў лёгка: пакуль Мікола дасяваў апошнія гектары, Пятро зганяў у вёску, схадзіў у краму, прыдбаў там пару бутэлек віна і, заціснуўшы іх пад пахай, ужо паспеў вярнуцца да трактара... Адтуль пачуў гул машыны, убачыў, што да іх на «УАЗе» падрульвае старшыня. «Што ж рабіць, — падумаў Пятро, — куды схаваць віно, калі навокал голае поле?»

На ім поруч была толькі сеялка, таму хлопец не прыдумаў нічога лепшага, як засунуць бутэлькі ў зерне.

З машыны тым часам выйшлі старшыня і два мужчыны пры гальштуках. Ім (падобна, правяральшчыкам?) гаспадар расказваў пра ход пасяўной, нахвальваў практыкантаў, якіх у ягоную гаспадарку ці не сам бог паслаў, бо дужа ж добрыя хлопцы: і працуюць ад душы, і не кураць, не п'юць...

— А чым жа сеялі? — пацікавіўся нарэшце адзін з правяраючых. — Насенне ў іх ці пратраўленае?

— Ну вядома ж, — адказаў старшыня.

— Так, — дружна дадалі хлопцы.

Але правяральшчыку, мусіць, мала было пачуць, яму хацелася гэта ўбачыць. Таму ён ускочыў на падножку сеялкі, адкінуў вечка на скрыньцы з зернем, засунуў у яго руку (як падалося Пятру, — у тым самым месцы, дзе ляжалі бутэлькі!).

«Ну ўсё, спаліліся», — з жахам падумалі студэнты, бо ведалі, што тады практыку іх ацэняць на двойкі, пра віно паведамяць у тэхнікум, і ўсё — пішы прапала: не бачыць ім дыпломаў, як сваіх вушэй!

Правяральшчык тым часам разглядаў на далоні зерне:

— Не падманулі, — загадкава прызнаў, — і сапраўды пратраўленае...

Абмацаў ён тыя бутэлькі ці не — засталося загадкай, але ж страху студэнты хапілі напоўніцу!

Яны ж — і на ўсё жыццё — запомнілі крылатае: не рабі дурнога — і не бойся нікога.

**Аляксандр Матошка,**
*в. Янкавічы, Расонскі раён.*

## Дзе быў?

...Гадоў 50 таму запрасіў мяне сусед на бяседу, пасадзіў (так выпала) ля акна. І міжволі азірнуўся на падаконнік — заўважыў, што там сціркa ляжыць і памада. Дзіўнае суседства, але ж няхай сабе, бо тут якраз чаркі паналівалі, тосты пайшлі. Госці сталі выпіваць і закусваць, гамонку весці ды песні пець...

Урэшце — мужчыны прытаміліся, заспяшаліся на перакур. Следам за імі, за кампанію, выйшлі на двор і жанчыны. Я ж не курыў, а таму застаўся на месцы.

Помню ад няма чаго рабіць яшчэ раз паглядзеў на падваконне, потым узяў адтуль сціркy, а са стала нож і неўпрыкмет для іншых выразаў... вусны, пафарбаваў іх памадай — зрабіў адбіткі на сваіх руках...

А далей болей, як той казаў: выйшаў на панадворак, дзе курылі бяседнікі, спытаў у аднаго з мужчын, у каго тут самая раўнівая жонка. Мне паказалі...

Я (жартаваць дык жартаваць) прыкінуўся п'яным, улукаткі падышоў да таго гаротніка, на вуха спытаў, чаму ён не курыць?

— Ды кінуў, — прызнаўся мужчына, — бо мая некалі сказала, што не пойдзе за мяне, калі буду курыць.

— Малайчына. Паважаю, — пахваліў чалавека я і з дапамогай той самаробнай «пячаткі» на шчацэ яго пакінуў досыць прыгожы «пацалунак».

Потым заўважыў, што ён нейкі дужа цвярозы, і папытаўся, ці напіваецца ён, калі ў гасцях?

— Не, бронь божа, ніколі... — пахваліўся мужчына.

Я зноў «адвесіў» «пацалунак».

Пра нешта мы гаварылі яшчэ. Але ж гаспадар тым часам ужо клікаў усіх за стол.

Госці няспешна рушылі ў кватэру, паселі. Мы з маім суразмоўцам падцягнуліся таксама, хоць і апошнімі: я яго (у пацалунках) спецыяльна наперад прапусціў. Застольнікі зглядзелі — і адразу ў рогат, а жонка адпаведна ў крык:

— Дзе ты быў? — пытаецца.

Мужчына ў адказ толькі вачыма лыпае:

— Дзе-дзе? Дзе ўсе, там і я...

— Але ж людзі як людзі ў хату прыйшлі, а ты... Паглядзі на сябе!

Зрабіць гэта зусім проста было — побач у вітальні вісела люстэрка. Мужчына паглядзеўся ў яго, «пагладзіў» шчокі і рушыў да мяне.

Шчыра кажучы, думаў, што надае кухталёў, але ж той хіба пагразіўся: дзякаваць богу, з гумарам чалавек быў: зразумеў, што жартаваў.

Пакуль госці смяяліся, мы з ім разам адмывалі рукі і шчокі.

...З таго дня, з той бяседы ўга колькі часу прайшло: здавалася, што ўсё забылася, а, бач, малюнак са «Звязды» нагадаў.

**Міхаіл Чарняўскі,**
*к.п. Нарач.*

## Падрыў аўтарытэту

У прыклад унуку Дзіму бабуля заўсёды ставіла ягонага тату. Маўляў ён, яе сын, хлопчыкам быў проста ідэальным: вучыўся толькі на «добра» ды «выдатна», паводзіў сябе ўзорна, ва ўсім дапамагаў, а ўжо слухаўся... «Таму і ў інстытут адразу паступіў, — рабіла высновы бабуля, — добрую прафесію атрымаў, пасаду займае...»

Дзіма таксама хлопчык нішто сабе: добрыя адзнакі са школы носіць. Але ж не заўсёды: бывае, што калі-нікалі «праскочыць» сямёрка. І ўжо тады бабуля не забудзецца, не прапусціць, абавязкова «завядзе» сваё ўлюбёнае: «А вось твой тата...»

Невядома, колькі б так цягнулася, калі б аднойчы Дзіма не знайшоў татаў дзённік за дзявяты клас, калі б на свае вочы не ўбачыў, што ўсе старонкі ў ім і сапраўды запоўнены прыгожым роўным почыркам, чацвёркамі ды пяцёркамі (найлепшымі тады адзнакамі), прычым па ўсіх без выключэння прадметах...

Але ж раптам — што гэта? — тлустая агідная... двойка і прыпіска да яе: «Не вывучыў верш «Кому на Руси жить хорошо?»

А далей — болей: яшчэ праз колькі старонак запіс класнага кіраўніка: «Паважаныя бацькі! Ваш сын біў аднакласнікаў венікам».

...Цяпер бабуля, што называецца, прыкусіла язык: ва ўсякім разе не так часта прыгадвае ранейшае «А вось твой тата...», бо Дзіма тады абавязкова прадоўжыць гэты сказ кароткім: «...атрымліваў двойкі па рускай літаратуры і біў аднакласнікаў венікам».

**Фаіна Касаткіна,**
*г. Паставы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*




■ Неасабісты суб'ектыў



# ПАКАЛЕННЕ «ЗЭТ»

## Які працяг пасля апошняй літары алфавіта?

УЧОРА, бадай, упершыню адчула, што мне столькі гадоў, колькі напісана ў пашпарце. Не тое што недзе кальнула ці стрэльнула або хтосьці цёткай назваў — да гэтага ставілася лёгка і нават з гумарам. А тут — усе пражытыя гады зваліліся на галаву цяжарам, бы глыба снегу з даху: і мякка, здаецца, і небалюча зусім, а некалькі хвілін адчуваеш сябе агаломшаным і збянтэжаным, пакуль не ачомаешся. Дык вось, у такі стан лёгкага шоку прывёў мяне ўчора хлопец у супермаркеце. Там зараз поўна практыкантаў з гандлёвага каледжа — хто на касе пад прыглядам старэйшых, хто на раскладцы тавараў, хто ў аддзеле. Гэтага — хударлявага і бледнага — паставілі на адказны ўчастак: агародніну ды садавіну ўзважваць. Небарака ніводнага кода не ведае, за кожным разам бегае на цэтлікі напісаныя глядзець — памыліцца баіцца. Чарга ўвечары вялікая, людзі ад такой маруднасці хвалююцца. А ў гэтага на твары — поўная «непрабівальнасць» — ні адзін мускул не зварухнецца (хто яго ведае, можа, іх у каледжы гэтаму вучаць?).

З гэтым выразам ён хвіліны тры разглядаў пакладзены мной на вагу пакет з памідорамі. Пасля ўзяў яго, павольна пасунуўся да латкоў з агароднінай — пачаў тыя памідоры па адным вымаць і параўноўваць. Спачатку яназірала за ім з усмешкай, пасля, калі ён ляніва так спытаўся: «А вы сапраўды ўсе адсюль бралі?», зразумела, што гэта малое стварэнне падазрае мяне калі не ў крадзяжы, дык у тым, што хацела купіць дарагое танней. Станоўчы адказ яго яўна не задаволіў, ён стаяў у нерашучасці, красамоўна пазіраючы то на мяне, то на тыя няшчасныя чатыры памідоры... «Малады чалавек, — з цяжкасцю стрымліваючы сябе, я старалася быць вельмі ветлівай. — Паглядзіце на мяне: я што, буду спрабаваць вас падмануць з-за аднаго памідора?» Хлапчына, усім сваім выглядам паказваючы, што ўсё роўна мне не верыць, махнуў рукой, наклеіў на пакет цану і выдаў: «Ладно, женщина, не напрягайтесь...» Народ засмяяўся, я таксама — ад гэткай нахабнасці і бесцырымоннасці толькі смяяцца і засталося, а без пяці хвілін спецыяліст сферы гандлю так, здаецца, і не зразумеў, чаго гэтыя дзядзькі ды цёткі ўсміхаюцца, скрушна ківаючы галовамі... А з той чаргі разважліва сказаў: «Чаго дзівіцца, яны цяпер усе такія».

ВОСЬ тут я і зразумела, якая бездань паміж намі і нашымі, па сутнасці, дзецьмі, якія так незаўважна выраслі. Здавалася б, гэта адлегласць, якую ніяк не скараціць, большая паміж тымі, каму пад (за) сорак і іхнімі бацькамі, бо наша пакаленне валодае ўсімі найноўшымі тэхналогіямі, і з камп'ютарамі мы на «ты», і з сучаснай бытавой тэхнікай, чаго не скажаш пра большасць нашых бацькоў, якім пад (за) семдзесят. З дзецьмі, па логіцы, павінна быць прасцей: яны, як і мы, сядзяць у сацыяльных сетках, пампуюць з сеціва кніжкі і фільмы, хутка (ну, можа, крыху хутчэй) разбіраюцца ў самым наварочаным «гаджэце». Але тут «намалявалася» бездань зусім іншага кшталту, і яна, калі прыгледзецца, палохае: справа ў чалавечых адносінах, у камунікацыі з людзьмі — роднымі, блізкімі і зусім незнаёмымі. Дакладней, у адсутнасці навыкаў гэтага камунікату — не на старонках сацыяльных сетак, не ў месенджары, а ў рэальным жыцці. Той нявітлівы хлопчык у супермаркеце адказаў мне, па сутнасці, фразай, якой бы каментаваў нейкую сітуацыю ў віртуальнай перапісцы, і з яго пункту гледжання гэта абсалютна нармальна. І ён абсалютна шчыра не зразумеў нашага абурэння, яно яму, па сутнасці, «да лямпачкі». Вось калі б гэта выказванне не сабрала ў сеціве «лайкаў» ад соцень зарэгістраваных «сяброў» — тады была б праблема.

ЗНАЁМАЯ дзялілася нядаўна: «Ведаеш, я заўсёды, калі прыязджаю да мамы, стараюся пасядзець з ёй, паклаўшы галаву ёй на калені. Яна мяне гладзіць па валасах — і ўсе праблемы знікаюць, лёгка так становіцца. І мне так хочацца сваю Машку (дачка ў яе першы курс універсітэта скончыла) таксама вось так пагладзіць па валасах, каб і ёй лягчэй стала, і яна падтрымку адчула... Дзе там! Не перашкаджай, кажа, мама, вельмі я занятая, у мяне тут перапіска важная, а ты са сваім глупствам! І сядзіць, у планшэт угледзеўшыся, нават вачэй не падняла. Ды каб жа толк з гэтай перапіскі быў! Яна ў свае амаль дзевятнаццаць ні з адным хлопцам рэальна не сустракалася, у яе ўвесь досвед асабістага жыцця там, у сеціве. Там яны на «спатканні» ходзяць, мілуюцца, сварацца, разыходзяцца, так адно аднаго ніколі і не ўбачыўшы. Так што я ўжо пачынаю думаць, што ўнукаў мне не дачакацца...»

У іншай прыяцелькі сын, блукаючы суткамі па сеціве, знайшоў-такі дзяўчыну нармальную, якую віртуальныя сустрэчы не задаволілі. Яна да яго ажно са Львова ў Мінск прыязджае. Дык бацькі яго і бабуля на тую дзяўчыну маліцца гатовы: жывая! сапраўдная! Бо іх нашчадак — вельмі прыгожы, дарэчы, хлопец — гадоў да дваццаці двух тых дзяўчат толькі на маніторы і бачыў. Цяпер, калі ўкраінская госця прыязджае, ім стварающа ўсе ўмовы, каб пабылі ўдваіх: бабуля кватэру вызваляе, перааязджаючы да дачкі. «Акруціць гэта спрытнюга твайго Сашку!» — папярэджваем мы сяброўку. «Я толькі пра гэта і мару! Хоць бабуляй, дасць бог, стану...»

ПСІХОЛАГІ падзялілі апошнія пакаленні людзей на тры часткі: пакаленне «ікс» — гэта дзеці 80-х, у 90-х нарадзілася пакаленне «ігрэк», а тыя, каму сёлета сямнаццаць і менш, — пакаленне «зэт». Вобразна, арыгінальна, праўда, яны і сапраўды — як тыя невядомыя з закручанага ўраўнення. Толькі вось... На літары «зэт» лацінскі алфавіт, калі памятаеце, заканчваецца. Пасля яе — суцэльныя прабелы...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец)
**извещает о проведении 30 августа 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел.руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Циклон инв. №20 г. в. в эксплуатацию — 2009. Местонахождение: Гомельская обл., Кормянский р-н, г. п. Корма, ул. Рогачевская, д. 21 | 660,00 | 33,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой, г. Гомель, ул. Малайчука,12. Конт. тел. 8 (044) 769-19-61 – Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов — 5% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000 Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, БИК BAPBBY23912, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах.

**2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 28 июля 2017 г.** по адресу: ул. Гагарина, 20, г. Гомель в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 28 августа 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи **в течение 10 (десяти) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 №607). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 23-23-53, на сайте gomeloblreklama.by.**

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ №1, г. Витебск» сообщает:

**26 июля 2017 года** на внеочередном общем собрании акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск», (210026, г. Витебск, ул. Суворова,16) принято решение о выплате дивидендов за 1-е полугодие 2017 года.

Сумма дивидендов за 1-е полугодие 2017 года составляет 207 748,31 рубля. Размер начисленных дивидендов на одну простую (обыкновенную) акцию составляет 0,0464153974 рубля.

Дивиденды юридическим лицам выплачиваются путем перечисления на текущий (расчетный) счет до 22 августа 2017 года.

Дивиденды физическим лицам выплачиваются по итогам (результатам) 2017 года.

УНП 300000398

**Страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) № 321419 серия НВБ ЗАСО «Белнефтестрах» считать недействительными.**

УНП 101143603

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества должника
**(административно-бытовой корпус, г. Слуцк, пер. Толстого 1-й, 5)**

ОПИСАНИЕ

**Лот №1:** Здание административно-бытового корпуса, инв. № 640/С-52203, площадью 946,3 кв. м, 1974 г.п., по адресу: Минския обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Толстого 1-й, 5. Назначение – здание административно-хозяйственное. Составные части и принадлежности: А2/к – административно-бытовой корпус с тамбуром (1). Начальная цена – 129 668,80 бел. руб. Задаток – 12 966,00 бел. руб.

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Ипотека в силу закона. В случае продажи с публичных торгов (торгов) имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
2. При перерегистрации права собственности на объект аукциона Победитель аукциона (Претендент на покупку) в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь должен обратиться в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» с заявлением на изменение адреса объекта

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Лот №1 расположен на земельном участке площадью 4,4698 га с кадастровым номером 624650100001007257. Целевое назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода железобетонных изделий. Право постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не подлежащие реализации на аукционе. Описание права, ограничения (обременения) прав: ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений охранная зона тепловых сетей, площадь 0,0997 га.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 25.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже здания административно-бытового корпуса (Лот №1), проводимом 25 сентября 2017 г.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений и задатков – 21.09.2017 в 11.00.

